**Адкрыты ўрок па беларускай літаратуры ў 6 «А” класе**

**«С. Тарасаў “Еўфрасіння Полацкая”»**

**Тэма:** Сяргей Тарасаў. “Еўфрасіння Полацкая”

**Мэта:** узнавіць і пашырыць веды вучняў пра беларускую асветніцу і святую Еўфрасінню Полацкую, пазнаёміць з мастацкім увасабленнем яе вобраза ў творы С. Тарасава; выявіць вучнёўскія ўражанні ад прачытанага тэксту; дапамагчы асэнсаваць веліч постаці асветніцы, яе ролі ў беларускай гісторыі;спрыяць фарміраванню ў вучняў творчых, разумовых і даследчых здольнасцей, развіваць навыкі выразнага чытання, вуснага маналагічнага маўлення, умення працаваць у групах; спрыяць выхаванню павагі да сваёй гісторыі, свайго народа.

**Ход урока:**

1. **Арганізацыйны момант.**
2. **Уступнае слова настаўніка.**

Беларусь вабіць прыгажосцю свіх краявідаў, чаруюць вока блакітныя рэкі і азёры, зялёныя лясы і пералескі, шырокія палі і лугі. Але найбольш славіцца зямля пад белымі крыламі людзьмі. Менавіта яны складаюць багацце краіны, праслаўляюць і будуць праслаўляць Беларусь.

Далей падрыхтаваныя вучні чытаюць урыўкі з вершаў беларускіх паэтаў В. Іпатавай, В. Зуёнка, Д. Бічэль.

*1 чытальнік*

Беларусь, твая дачка я.
Зярнятка я, а ты мая ралля.
Якой жа мовы ад мяне чакаеш
Ты, узрасціўшая мяне зямля?

*2 чытальнік*

Я крывінка твая – крывічанка,
Я былінка твая – палачанка,
Як над пожняй тужлівая чайка,
Я лячу да цябе , Радзіма,

Са святога Ерусаліма.

*3 чытальнік*

Чую звон твой Сафія, чую
Скрозь стагоддзі і скрозь муры
У бяскрайнюю ноч глухую
І пад час світальнай зары!

*4 чытальнік*

Беларусь – Ефрасіння Святая,
памаліўшыся на раздарожжы,
павярні свае вочы да Божых –
Добры Божа цябе прывітае.

- Скажыце , калі ласка, пра каго ідзе гаворка ў гэтых вершаваных радках? Абгрунтуйце сваю думку.

3. **Тлумачэнне і замацаванне новага матэрыялу.**

Сапраўды, вершы прысвечаны Еўфрасінні Полацкай, унучцы слаўнага князя Усяслава Чарадзея, якая засталася жыць у памяці нашчадкаў. І сёння мы з вамі здзейснім падарожжа ў далёкае XII стагоддзе… **Эпіграфам** да нашага ўрока будуць словы Дануты Бічэль. **Тэма** сённяшняга ўрока: Сяргей Тарасаў. “Еўфрасіння Полацкая” **( запішыце, калі ласка, яе ў сшытку). Мэта –** узнавім і пашырым вашы веды пра беларускую асветніцу і святую Еўфрасінню Полацкую, пазнаёмімся з мастацкім увасабленнем яе вобраза ў творы С. Тарасава; выявім вашы ўражанні ад прачытанага тэксту; асэнсуем веліч постаці асветніцы, яе ролі ў беларускай гісторыі; будзем фарміраваць творчыя, разумовыя і даследчыя здольнасці, развіваць навыкі выразнага чытання, вуснага маналагічнага маўлення, уменне працаваць у групах; выхоўваць павагу да сваёй гісторыі, свайго народа.

Для таго, **каб дасягнуць пастаўленых мэт**, вы падзелены на групы: “Чытальнікі”, “Гісторыкі”, “Даследчыкі”. Дарэчы, прадстаўнікі групы “Чытальнікі” перад намі ўжо выступалі. А ўсе разам мы з вамі будзем яшчэ крытыкамі і аналітыкамі.У канцы ўрока кожная група прадставіць свой

праект “ Еўфрасіння Полацкая”, падрыхтаваныя для гэтага лісты ляжаць у вас на партах. На прыканцы ўрока ў вас павінна там з’явіцца ўсё тое, што, на вашу думку, звязана з імем славутай асветніцы.

Я ўжо вам сказала, што сёння мы адправімся ў старажытны Полацк XII стагоддзя. А яшчэ, каб лепш арыентавацца ў падзеях далёкага мінулага, мы з вамі патлумачым лексічнае значэнне некаторых слоў:

**Манастыр –** 1. Рэлігійная абшчына манахаў або манашак, якая ўтварае царкоўна-гаспадарчую арганізацыю. 2. Тэрыторыя, царква і жылыя памяшканні такой абшчыны.

**Сабор –** галоўная або вялікая царква ў горадзе, манастыры.

**Царква** – 1. Аб’яднанне паслядоўнікаў той або іншай рэлігіі, арганізацыі, якая кіруе рэлігійным жыццём. 2. Памяшканне, у якім адбываецца набажэнства.

**Ігуменння –** настаяцельніца праваслаўнага манастыра.

Перш, чым перайсці да аналізу твора С. Тарасава мы паслухаем выступленні прадстаўнікоў груп “ Гісторыкі” і “Даследчыкі”.

- Што вы ведаеце пра Еўфрасінню Полацкую?

**Паведамленні групы “Гісторыкі”.**

*Паведамленне 1.*Вядома, што да таго, як Еўфрасіння пайшла ў манастыр, яе імя было Прадслава . Жыла яна ў багатай сям’і. Калі споўнілася 12 гадоў, Прадслава пайшла ў манастыр, дзе перапісвала кнігі.

*Паведамленне 2.*Прадслава прыходзіць у манастыр. Яе цётка, удава князя Рамана Усяславіча, якая была ігуменняй, імкнецца яе адгаварыць. Але Прадслава дабіваецца свайго і пад імем Еўфрасіння таемна ад бацькоў прымае пострыг, ахвяруючы сябе Хрысту.

Даведаўшыся пра ўчынак дачкі, князь Святаслаў-Георгій ад гора рваў на галаве валасы, а княгіня Сафія галасіла па Прадславе, як па нябожчыцы.

*Паведамленне 3.*Я ведаю, што ў манастыры яна шчыра малілася, а таксама прадавала кнігі, грошы ж аддавала бедным людзям.

*Паведамленне 4.* Я чытала пра крыж, які для Еўфрасінні зрабіў Лазар Богша. Гэты крыж быў вельмі каштоўны для Беларусі, але, на жаль, ён знік у час вайны.

- Такім чынам, мы выявілі вашы веды пра Еўфрасінню Полацкую. Апавяданне Сяргея Тарасава раскажа нам пра дзейнасць Еўфрасінні Полацкай. Імя Сяргея Тарасава вам невядома, таму пра яго нам раскажа група “ Даследчыкі”.

**Паведамленні групы “ Даследчыкі”.**

*Паведамленне 1.*Сяргей Васільевіч Тарасаў – кандыдат гістарычных навук. З 1982 па 2006 год працаваў у Інстытуце гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Быў загадчыкам аддзела археалогіі сярэдневяковага перыяду. Даследаваў старажытны Мінск, праводзіў раскопкі. Аўтар больш за 50 навуковых прац, аўтар падручніка “Мая Радзіма – Беларусь” для 4 класа.

*Паведамленне 2.*Аўтар кніг для дзяцей і падлеткаў “Вясёлы ветрык”, “Фрэскі”, сааўтар мастацкіх зборнікаў. Ён быў вядучым шэрагу тэлепраграм на беларускім тэлебачанні: “Скарбы беларускай гісторыі”, “Кола часу” і іншых.

*Аналіз твора па агульных пытаннях:*

- Зачытайце радкі пра старадаўні Полацк, у якім гадавалася Прадслава.

Хочацца, адзначыць, што, па меркаваннях вучоных, менавіта ў Полацку знаходзіцца цэнтр Еўропы. Можа, гэта і , сапраўды, так, бо не адну славутую і знакамітую асобу нарадзіла гэта зямля. Паглядзіце, калі ласка , на фотаздымкі сучаснага Полацка.**( Фота на дошцы)** Ён і зараз прыгожы, усё там дыхае гісторыяй, і раней быў прыгожым. А вось так выглядаў Полацк у XII стагоддзі . Здаецца, нават, што камяні помняць адбіткі ног Прадславы, якая некуды спяшаецца….

- Куды спяшаецца Прадслава?
- Чаму ў горадзе добра ведалі дзяўчынку? Чым яна вызначалася?
- Які шлях выбрала сабе Прадслава? Чаму?

- Чаму яна не выйшла замуж?
- Дзе спачатку жыла Еўфрасіння? Чым займалася?
- Які манастыр пабудавалі пад Полацкам? ( Спаскі)
- Чаму цягнуліся сюды людзі?
- Якія справы сталі для Еўфрасінні важнымі і галоўнымі ў жыцці?
- Чым яна заслужыла шырокую вядомасць, людскую любоў і ўдзячнасць?
- Да чаго Еўфрасіння заклікала людзей? Якія яе павучэнні і запаветы трэба ведаць?

**Фізкультхвілінка**

Усе дружна ўсталі і пацягнуліся. Зараз мы з вамі здзейснім рытуал. Цягніцеся як мага вышэй да столі, а, калі зможаце, то і да самаго сонейка. Схапіце рукамі тую нябачную нітку і паднясіце да свайго сэрца . Будзем лічыць, што гэта нітка – ваш поспех, ваша шчасце. Зараз раскіньце рукі на поўную шырыню – чым шырэй, тым даўжэйшай будзе ваша нітка. А зараз зматайце яе ў клубок і пакладзіце ў кішэню, няхай вам заўсѐды шанцуе. Сядайце на свае месцы будзем працаваць далей, каб спадарыня мова дазволіла нам прадягнуць наша падарожжа ў мінулае далей.

*Аналіз твора па пытаннях да кожнай групы:*

**Група “Даследчыкі”:**

1. Чым прывабіў вас вобраз Еўфрасінні ў творы С. Тарасава?
2. На што вы звярнулі асаблівую ўвагу? Абгрунтуйце чаму.

**Група “ Чытальнікі”:**

1. За якое дабро людзі дзякавалі Еўфрасінні?
2. Знайдзіце і зачытайце ў тэксце радкі, якія перадаюць гонар за справы Еўфрасінні Полацкай, за радасць ад усведамлення таго, што яна дачка зямлі беларускай.

**Група “Гісторыкі”:**

1. Вызначце галоўную думку твора С. Тарасава.
2. Растлумачце сэнс радкоў эпіграфа да ўрока.

*Прагляд відэа*

А зараз, калі ласка, паглядзіце невялікі відэафільм пр Еўфрасінню Полацкую. Ён дапаможа сістэматызаваць нашы веды пра беларускую асветніцу і закончыць выкананне праекта.

*Выкананне і абарона праекта*

- Еўфрасіння Полацкая – заступніца Беларусі. У праваслаўі існуюць розныя формы ўшанавання святых. Адна з іх – гэта святкаванне 5 чэрвеня дня памяці Еўфрасінні Полацкай.

4. **Падвядзенне вынікаў, R, выстаўленне адзнак**

*Тэст*

1. Якое імя было ў Еўфрасінні Полацкай да пострыгу?

а) Еўдакія ; б) Прадслава; в) Еўпраксія

2. Як звалі бацьку Еўфрасінні ?

а) Рагвалод; б) Святаслаў-Георгій; в) Усяслаў

3. Колькі гадоў было Еўфрасінні, калі яна прыйшла ў манастыр?

а) 16; б) 20; в) 12

4. Настаяцельніцай якога манастыра стала Еўфрасіння?

а) Спаскага; б) Мірскага; в) Сафійскага сабора

5. Кім па замове Еўфрасінні Полацкай быў зроблены крыж?

а) Рагвалодам; б) Іаанам; в) Лазарам Богшам

6. Дзе памерла Еўфрасіння Полацкая?

а) у Полацку; б) у Іерусаліме

7. Калі святкуецца дзень памяці Еўфрасінні Полацкай?

а) 5 мая; б) 5 чэрвеня; в) 6 ліпеня

*Ключ*

- На ўроку мы даведаліся…
- Вучыліся…
- Можам прымяніць свае веды…

*Сінквейн*

Вучні зачытваюць свае сінквейны.

*Заключнае слова настаўніка*

У Евангеллі ёсць цудоўная прытча пра сейбіта, які ранняй вясной выйшаў у поле, каб пасеяць зерне. Ідзе сейбіт па свежых баразнах і старанна рассейвае насенне. Частка зерня падае пры дарозе, частка – на камяністую глебу ці ў зямлю, зарослую калючкамі. Але тое, што ўпала на добрую глебу, дасць у сто раз багацейшы ўраджай.

Вось такім першым сейбітам духоўнага насення – была наша славутая Прадслава са слаўнага горада Полацка, якая ў XII стагоддзі зразумела вялікую ролю асветы ў жыцці народа і аддала гэтай справе ўсе свае сілы.

5. **Д/з** Пытанні 8-9 с. 204.